ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7(1119) ● Чацвер, 26 лютага 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## 24 ЛЮТАГА ПАЧАЎ РАБОТУ XXV З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

## ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ
## ПРЭЗІДЫУМУ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР
## САВЕТУ МІНІСТРАЎ БССР

За паспяховую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі, уцягненню яе ў актыўную працоўную дзейнасць у студэнцкіх будаўнічых атрадах, высокія паказчыкі ў вучэбнай, вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Універсітэт сёння — адна з буйнейшых навучальных устаноў нашай краіны. Ажыццяўляючы планы партыі, навукова-педагагічныя работнікі прыкладаюць усе намаганні да таго, каб лепш узброіць маладых спецыялістаў сучаснымі ведамі, навыкамі арганізацыйнай і грамадска-палітычнай работы, уменнем выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы. Эфектыўнасць і якасць работы сталі баявым дэвізам універсітэцкага калектыву.

Выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты універсітэта паспяхова завяршылі дзевятую пяцігодку. За 1971—1975 гады Беларускі дзяржаўны універсітэт выпусціў каля 15 тысяч маладых спецыялістаў, звыш 500 скончылі аспірантуру. Высокіх вынікаў калектыў дабіўся ў сацыялістычным спаборніцтве ў гонар XXV з'езда КПСС.

Ва універсітэце развіваюцца і памнажаюцца слаўныя працоўныя традыцыі. За гады дзевятай пяцігодкі школу працоўных семестраў прайшлі звыш 10 тысяч студэнтаў, асвоена 21,4 мільёна рублёў капіталаўкладанняў, пададзены дзесяткі рацыяналізатарскіх прапаноў, сэканомлена будаўнічых матэрыялаў на суму 42,4 тысячы рублёў, здадзена ў эксплуатацыю больш чатырохсот аб'ектаў вытворчага і культурна-бытавога прызначэння.

Студэнты універсітэта добра працуюць і добра вучацца. 418 лепшых з іх у гэтыя дні падпісалі Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС.

У праекце ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады», у рашэннях толькі што адбыўшагася XXVIII з'езда КПБ перад вышэйшай школай, і асабліва перад універсітэтамі, пастаўлены новыя, яшчэ больш грандыёзныя і адказныя задачы ў развіцці навукі, у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. У рашэнні гэтых задач нам давядзецца вызначыць ролю і ўдзел кожнага навуковага работніка, кожнага камуніста і камсамольца, выкладчыка і студэнта.

Прымаючы Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР, выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна горача дзякуюць Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Беларусі і ўраду Беларускай ССР за высокую ацэнку іх штодзённай дзейнасці і запэўніваюць, што калектыў адкажа на яе самаадданай працай, выдатнай вучобай. Мы прыкладзем усе намаганні, веды, уменне і вопыт, каб з гонарам выканаць задачы, пастаўленыя Камуністычнай партыяй перад вышэйшай школай, і далей будзем актыўна працаваць на карысць нашай Радзімы, набліжаючы наша светлае камуністычнае заўтра.

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**



*З мэтай дасканалення падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, сумеснай распрацоўкі найбольш актуальных навуковых праблем і хутчэйшага ўкаранення іх у вытворчасць мэтазгодна стварэнне вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання БДУ — вытворча-тэхнічнае аб'яднанне «Інтэграл».*

*НА ЗДЫМКУ: сумесную пастанову аб стварэнні аб'яднання падпісваюць рэктар БДУ імя У. І. Леніна У. М. СІКОРСКІ, сакратар парткома універсітэта Т. Я. ДУДАРАВА і генеральны дырэктар ВТА «Інтэграл» М. ГАЙДЭНКА, сакратар парткома аб'яднання В. КАРУМАЎ.*

*Фота Д. ПРЭСА.*

## ТЭЛЕГРАМА XXV З'ЕЗДУ КПСС

*Сэрцы 10 тысяч студэнтаў, камсамольцаў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна б'юцца сягоння ў такт з боем Крамлёўскіх курантаў, якія пачалі адлік мінут, гадзін работы XXV з'езда Камуністычнай партыі нашай краіны.*

*Форум партыі Леніна, якая ўвасабляе розум, гонар і сумленне нашай эпохі, для нас падзея вялікай значнасці.*

*Кожны з нас перапоўнены пачуццём гордасці за тое, што з'яўляецца сучаснікам з'езда.*

*Табе, з'езд камуністаў, дакладваем:*

*1.350 студэнтаў універсітэта — выдатнікі вучобы;*

*7.063 студэнты паспяхова працуюць у студэнцкіх навуковых лабараторыях;*

*10.613 студэнтаў за гады дзевятай пяцігодкі прайшлі школу трэцяга працоўнага семестра. На будаўнічых пляцоўках Беларусі, Казахстана, Томскай, Пскоўскай і Смаленскай абласцей імі асвоена каля дваццаці двух мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў, пабудаваны дзесяткі жылых дамоў, жывёлагадоўчых фермаў, праведзена вялікая ідэалагічная работа. У перыяд зімовых канікул на ўдарнай камсамольскай будоўлі паспяхова працаваў студэнцкі будаўнічы атрад імя XXV з'езда КПСС.*

*Камсамольская арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна запэўнівае XXV з'езд роднай партыі, што прыкладзе ўсе намаганні, каб кожны дзень дзесятай пяцігодкі зрабіць днём выдатнай вучобы, ударнай працы, высокай грамадска - палітычнай актыўнасці.*

**КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА.**

## УВАГА ВАЕННА-ПАТРЫЯТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ

20 лютага адбылося пасяджэнне сектара абаронна-масавай работы партыйнага камітэта БДУ, які ўзначальвае начальнік ваеннай кафедры універсітэта Б. М. Глазкоў.

На пасяджэнні былі намечаны мерапрыемствы па абаронна-масавай рабоце ў бягучым паўгоддзі.

У выступленні старшыні ДТСААФ М. Гарлатава адзначалася, што на факультэтах складаюцца планы работы па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. У іх уваходзіць правядзенне лекцый, гутарак, вечароў, сустрэч з ветэранамі вайны, наведванне памятных месц (Хатыні, Брэсцкай крэпасці і інш.). Вялікая работа вядзецца па прапагандзе ваенна-прыкладных відаў спорту.

У студзені ў БДУ быў аб'яўлены месячнік у гонар 58-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Аднак не ўсе факультэты актыўна ўключыліся ў правядзенне месячніка (напрыклад, юрфак).

На ваеннай кафедры праводзяцца сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, на якія з задавальненнем прыходзяць студэнты ўсіх факультэтаў.

Некаторыя факультэты (фізфак, ФПМ) арганізуюць выезды ў падшэфныя воінскія часці; на хімфаку прайшоў вечар па ваенна-патрыятычнай тэматыцы.

Затым выступіў начальнік ваеннай кафедры Б. М. Глазкоў. Ён адзначыў, што яшчэ не на ўсіх факультэтах у поўнай меры зразумелі важнасць ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў. Неабходна часцей арганізоўваць спартыўныя святы, сустрэчы з падшэфнымі часцямі, ваенныя зборы. Час, які застаўся да святкавання 31-й гадавіны Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, трэба выкарыстаць з найбольшай карысцю, правесці як мага больш мерапрыемстваў, яшчэ раз прагледзець планы абаронна-масавай работы на факультэтах, ліквідаваць недахопы.

**Л. АНДРЭЕВА.**

### СУСТРЭЧА З МІНІСТРАМ

Вынікі работы XXX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН былі тэмай сустрэчы прафесарска - выкладчыцкага саставу БДУ з міністрам замежных спраў БССР А. Е. Гурыновічам. У гутарцы з міністрам былі закрануты многія важныя праблемы сучаснасці: аздараўленне міжнароднага палітычнага клімату, умацаванне міру і міжнароднай бяспекі.

Сустрэча з міністрам— адна з многіх, якія стаяць у плане сістэматычнага інфармавання партыйнага і прафсаюзнага актыву, прафесарска - выкладчыцкага саставу, куратараў універсітэта аб падзеях унутранага і міжнароднага жыцця. План распрацаваны парткомам нашай установы.

### КАМУНІСТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ — ЯКАСЦЬ

Пасля ўсебаковага разгляду на расшыраным пасяджэнні рэктарата, партыйнага камітэта і грамадскіх арганізацый вынікаў даследаванняў сацыялагічнай лабараторыі БДУ было прынята рашэнне аб стварэнні семінара па маральнаму і эстэтычнаму выхаванню. Слухачы семінара — работнікі дэканатаў, сакратары партыйных арганізацый, куратары вучэбных груп, актыў факультэтаў. Прайшло двое заняткаў семінара. З лекцыямі выступілі міністр замежных спраў БССР А. Е. Гурыновіч, дацэнт кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму С. Д. Лапцёнак.

### ДНІ НАВУКІ

19 лютага ў гасцях у рабочых МАЗа пабывала 18 навуковых работнікаў БДУ. Пачаліся традыцыйныя выезды вучоных універсітэта на прадпрыемствы горада. У час абедзеннага перапынку яны чытаюць лекцыі, робяць даклады, прысвечаныя галоўнай падзеі часу — XXV з'езду КПСС, расказваюць аб дасягненнях савецкіх вучоных за пяцігодку.

Таварыствам «Веды» сумесна з парткомам універсітэта не толькі арганізаваны выезды вучоных, але і распрацавана каля 30 новых цыклаў лекцый па пытаннях грамадскіх і прыродазнаўчых навук. У цэхі і аддзелы мінскіх прадпрыемстваў прыйдуць брыгады лектараў.

### КУБІНСКІЯ СТУДЭНТЫ ПРЫМАЮЦЬ ГАСЦЕЙ

Кампазітара Ігара Лучанка — лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола — ведае ўся Беларусь. З ім захацелі пазнаёміцца і кубінскія студэнты, якія навучаюцца ў БДУ. Разам з Лучанком на «агеньчык» інтэрната № 7 прыйшлі члены ансамбля «Верасы». Сустрэча прысвячалася XI Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў, які адбудзецца ў Гаване. Выступалі госці і гаспадары. Ігар Лучанок падарыў кубінскім сябрам пласцінкі з запісамі сваіх песень.

### «КРЫЖАЧОК» — НА «БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ»

Нядаўна наш народны ансамбль танца «Крыжачок», якім кіруе заслужаны дзеяч культуры М. В. Лапша, вярнуўся з паездкі ў Маскву. Ансамбль прымаў удзел у тэлевізійнай праграме «Мой адрас — Савецкі Саюз», якая будзе перадавацца па Інтэрбачанню.

У Маскве быў зроблены запіс поўнай праграмы танцаў «Крыжачка» на плёнку.

Народны артыст СССР Ігар Маісееў, які прысутнічаў на рэпетыцыях ансамбля, даў выступленням танцораў высокую ацэнку.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

# САКАВІЦКІ КАЛЯНДАР



1—10 гадоў назад (1966) савецкая аўтаматычная станцыя «Венера-3», якая была запушчана 16 лістапада 1965 года, дасягнула планеты Венера.

4—55 гадоў з дня ўтварэння (1921) Абхазскай АССР.

8—МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ.

11—50 гадоў з дня адкрыцця (1926) VII з'езда РЛКСМ. З'езд прыняў рашэнне аб перайменаванні камсамола ва Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі (ВЛКСМ).

12—1917—Лютаўская буржуазна - дэмакратычная рэвалюцыя ў Расіі. Звяржэнне царскага самадзяржаўя. Утварэнне Петраградскага Савета працоўных і салдацкіх дэпутатаў.

12—70 гадоў з дня нараджэння (1906) Сулеймана Рустама, азербайджанскага савецкага паэта і драматурга.

14—1883—памёр Карл Маркс.

18—ДЗЕНЬ ПАРЫЖСКАЙ КАМУНЫ.

21—70 гадоў з дня нараджэння Самеда Вургуна (1906—1956), азербайджанскага савецкага пісьменніка.

23—100 гадоў назад (1876) П. М. Яблычкаў атрымаў патэнт на вынайдзеную электрычную свячу—першую электрычную крыніцу святла.

27—МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ТЭАТРА.

27—90 гадоў з дня нараджэння С. М. Кірава (1886—1934), дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы.

28—200 гадоў з дня заснавання (1776) у Маскве Вялікага тэатра СССР.

29—150 гадоў з дня нараджэння Вільгельма Лібкнехта (1826—1900), дзеяча нямецкага дэмакратычнага і працоўнага руху.

30—200 гадоў з дня нараджэння В. А. Трапініна (1776—1857), рускага мастака.

# АБ САБЕ І АБ КІНО

Міхаіл Пугаўкін: «Я чалавек харошы, добры, у асноўным станоўчы».

Журналісцкі лёс звёў нас у адной з камандзіровак з папулярным артыстам кіно Міхаілам Іванавічам Пугаўкіным. І мы ўзялі ў яго інтэрв'ю.

**— Скажыце, калі ласка, Вам даводзілася калі-небудзь здымацца на кінастудыі «Беларусьфільм»?**







— Так, я быў запрошаны беларускімі кінематаграфістамі для ўдзелу ў здымках кінакарціны «Прыгодны да нестраявой». На мой погляд, фільм удалы. Працаваць было цікава. Думаю, што дружба з беларускім кіно ў нас будзе і ў далейшым моцная.

**— Ваш любімы камедыйны акцёр?**

— У нас у краіне шмат цудоўных, я б сказаў, моцных акцёраў. На мой погляд, Аркадзій Райкін, калі гаварыць аб акцёрах камедыйнага жанру, можа лічыцца лепшым. Праўда, ён больш выступае ў тэатры і на эстрадзе, але і работа ў кіно стала значнай і яркай. Без перабольшання можна назваць Райкіна кінаартыстам нумар адзін. Для мяне ён эталон культуры і глыбіні ў мастацтве. Яго героі жывуць 2—3 хвіліны, але іх характары, яны самі паўстаюць перад намі ў поўным развіцці. Падуладныя таленту і востраму розуму, яны быццам паспяваюць і нарадзіцца, і пражыць гады юнацтва, і састарыцца. Гэта вяршыня акцёрскага майстэрства. Таму для мяне Аркадзій Райкін заўсёды вялікі прыклад. А ўвогуле ў кожнага камедыйнага акцёра свой аб'ект перайманння. Напрыклад, Савелій Крамараў спіць і бачыць сябе падобным на Луі дэ Фюнеса. Не магу не сказаць і пра Масквіна, які даў мне ў студыі МХАТа незабыўны ўрок. Гэта таксама наша гордасць. Што датычыць маладых акцёраў, то, несумненна, тут трэба адзначыць Леаніда Кураўлёва. Лічу, што гэта светлая асоба ў вялікім патоку камедыйных акцёраў, якія прыйшлі ў кіно параўнальна нядаўна. Ёсць у мяне і іншыя любімыя акцёры. Гэта І. Ільінскі, М. Жараў. Але яны, мне здаецца, некалькі ўстарэлі. Хачу тут жа заўважыць: камедыйнаму акцёру вельмі важна своечасова пайсці з экрана.

З зарубежных акцёраў, якія здымаюцца ў камедыйных ролях, мне падабаюцца Бурвіль і вельмі абаяльны Жан-Поль Бельмандо.

**— Вы ніколі не хацелі сыграць драматычную ролю?**

— Прызнацца, хацеў, і цяпер хачу. Мне нават прапаноўвалі работу ў сур'ёзным жанры, але пакуль я не знайшоў падыходзячага героя, майго героя.

**— Кажуць, што Вы акцёр трэцяга дубля. Ці праўда гэта?**

— Гэта так. Як ні дзіўна, але трэці дубль у мяне заўсёды самы ўдалы. Гэта стала нейкай заканамернасцю, растлумачыць якую проста немагчыма. Прыпамінаю выпадак. Аднойчы, на здымачнай пляцоўцы, я загадзя папярэдзіў рэжысёра, што калі ён будзе здымаць мяне больш трох разоў у адной і той жа сцэне, то сам зразумее, што гэта была марная праца не толькі для яго. «Няўжо вы не верыце ў сапраўдную дасканаласць?» — спытаў ён. «Не, у дасканаласць я веру, але я, як бы вам сказаць, акцёр трэцяга дубля». І, уяўляеце, я зноў меў рацыю! Мы рабілі чацвёрты, пяты... сёмы дубль, а самым якасным зноў быў трэці.

А ўвогуле я лічу, што ў камедыйных кінафільмах без дубляў не абысціся. Напрыклад, Чарлі Чаплін рабіў да 30 розных дубляў, выбіраў з гэтага матэрыялу лепшы і, несумненна, выйграваў у многім. Драматычным жа акцёрам, па-мойму, так званы дубляж не патрэбен. Таму што плакаць пяць-шэсць разоў і ўвесь час укладваць у гэтыя слёзы тое шчырае трагічнае пачуццё, якое ўласціва трагічнаму герою, — немагчыма. Вы, мабыць, помніце эцюд з кінафільма «Дванаццаць крэслаў», дзе мне прыйшлося секчы гэты злашчасны гарнітур на беразе бушуючага мора. Дык вось. Мы не адзін тыдзень чакалі шасцібальны шторм. Калі такое надвор'е стала падыходзячым, адразу ж пачалі работу. І за чатыры гадзіны знялі велізарны кавалак. У гэты дзень усё абышлося адным дублем.

**— Колькі працягваецца Ваш рабочы дзень у час здымак?**

— Вядома, што ён у нас не нарміраваны. Асабліва доўга даводзіцца працаваць на «натуры». Толькі ўзышло сонца — усё жыве здымкамі. Часта яны працягваюцца 15 гадзін. Заканчваем з заходам сонца.

**— Вашы любімыя камедыйныя фільмы?**

— «Пёс Барбос і незвычайны крос», «Волга-Волга» — я ад іх ў захапленні.

**— Раскажыце, калі ласка, пра Вашы апошнія работы ў кіно.**

— У бліжэйшы час на экраны краіны выйдзе фільм з маім удзелам. Гэта захапляючая кінакарціна знята на кінастудыі імя А. М. Горкага. А называецца яна «Русалачка». Пастаноўка вядомага рэжысёра Бычкова. Яго добра ведаюць гледачы па фільму «Горад майстроў». Зусім нядаўна я іграў яшчэ адну ролю ў шматсерыйнай кінакарціне «Два капітаны». Мой герой — нягоднік, невыносная натура.

**— Ваша захапленне па-за работай у кіно?**

— Па-першае, мне часта даводзіцца выступаць перад калгаснікамі і рабочымі, ездзіць па многіх гарадах. Сёння — Віцебск, Гомель, Магілёў, Талін, затым — Мінск. Асабліва прыемна бываць у гасцях у студэнтаў — вельмі цікаўны народ!

Па-другое, у адносінах так званага «хобі» — я чалавек старамодны. Чаму? У мяне вялікая сям'я: тры дачкі і тры ўнучкі, якіх я вельмі люблю і ўдзяляю ім увесь свой вольны час. Люблю прыроду. І бываю шчаслівы, калі ўдасца вырвацца куды-небудзь за горад, як мага далей ад шуму і мітусні, надта мяне стамляючых. Да ўсяго гэтага — я пешаход.

У дадатак — я ў нечым падобны на кракадзіла Гену, таму што заўсёды шукаю і знаходжу харошых і добрых людзей.

З Міхаілам Іванавічам вялі гутарку **А. БАСАЎ, А. ЛАБАДА, О. МАРОЗАЎ**, студэнты факультэта журналістыкі.

Фота аўтараў.





# КВЕТКІ ТРЭНЕРУ

**Калі мінскія дынамаўцы праводзяць чарговую сустрэчу, ён непрыкметна ўслед за футбалістамі выходзіць на стадыён. Толькі футбалісты на зялёнае поле, а ён, Яўгеній Іванавіч Гаранскі, заслужаны трэнер РСФСР і УССР, галоўны трэнер мінскага «Дынама», разам са сваімі памочнікамі і запаснымі ігракамі займае месца побач з футбольным полем. Потым яны спакойна і ўважліва сочаць за паядынкам.**

**А вось тут, у студэнцкай аўдыторыі галоўнага корпуса БДУ, яны разам, побач — студэнты-балельшчыкі і галоўны трэнер іх любімай каманды. Разам з ім на сустрэчу са студэнтамі і выкладчыкамі БДУ прыйшоў варатар каманды Міхаіл Вергіенка. Зусім нядаўна на камсамольскім сходзе футбалісты-дынамаўцы абралі яго сваім камсамольскім важаком.**

**Яўгеній Іванавіч расказаў паклоннікам дынамаўцаў, што каманда пачала рэгулярныя трэніроўкі ў сярэдзіне снежня. У гэтым годзе разам з камандай працуе навуковая брыгада, у саставе якой шэсць супрацоўнікаў РТІ і два з Беларускага дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры. Абследаваўшы футбалістаў пасля невялікага зімовага перапынку, вучоныя засталіся задаволенымі здароўем спартсменаў.**

**Яўгеній Іванавіч шчыра падзякаваў балельшчыкам за іх вялікую ўвагу да дынамаўскага калектыву.**

**Затым гэтую своеасаблівую прэс-канферэнцыю працягваў Міхаіл Вергіенка. Ён расказаў аб жыцці калектыву, аб яго справах і задачах. Камсорг і галоўны трэнер адказалі на шматлікія пытанні студэнтаў.**

**Шчыра дзякуючы ганаровым гасцям, студэнты паднеслі ім кветкі і пажадалі ўдалага выступлення ў вышэйшай лізе.**

**В. ФІЛІПЧЫК.**

*28 лютага ў 19 гадзін у актавай зале БДУ усіх студэнтаў, выкладчыкаў, работнікаў універсітэта чакае сустрэча з вядучымі спевакамі, рэжысёрамі, мастакамі Тэатра оперы і балета Беларускай ССР. Праводзіць сустрэчу камітэт камсамола сумесна з праўленнем клуба БДУ.*

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 01088 Заказ № 289.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.